# ШЛЯХ ДА ЎЗАЕМНАСЦІ

23—24 лістапада 2000 г. у г.Гродна прайшла Міжнародная навуковая канферэнцыя «Шлях да ўзаемнасці». На пленарным пасяджэнні прагучалі даклады дацэнта Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта, кандыдата гістарычных навук Я.У.Півульскага «Беларуска-польскае трансгранічнае супрацоўніцтва як інстытут інтэграцыі Беларусі ў Еўропу», прафесара Беластоцкага універсітэта Г.Тарановіча «Беласточчына як апора беларускай духоўнасці», прафесара Беластоцкага універсітэта, доктара сацыялагічных навук У.Паўлючука «Беларусь і польскае пытанне».

Падчас канферэнцыі працавалі літаратурна-моўная секцыя (кіраўнікі — С.П.Мусіенка, доктар філалагічных навук, прафесар ГрДзУ; В.Белаказовіч, доктар філалагічных навук, прафесар Вармінска-Мазурскага універсітэта), гісторыка-культурная секцыя (кіраўнікі — У.Паўлючук, доктар сацыялагічных навук, прафесар Ягелонскага і Беластоцкага універсітэтаў; В.В.Швед, кандыдат гістарычных навук, дацэнт ГрДзУ).

На літаратурна-моўнай секцыі прагучала 16 рэфератаў, сярод якіх — «Беларускі фальклор у творах А.Міцкевіча» (С.П.Мусіенка, прафесар ГрДзУ), «Творчасць Э.Ажэшкі і Беларусь» (К.І.Лецка, выкладчык кафедры польскай філалогіі ГрДзУ), «Вобраз малой радзімы ў творчасці беластоцкіх пісьменнікаў» (А.А.Раманчук, аспірант ГрДзУ), «Пра некаторыя асаблівасці антропаанамастыкону на Падляшшы ў XVI ст.» (Л.Цітко, доктар філалагічных навук

універсітэта ў Беластоку), «Размоўны варыянт беларускай мовы перасяленцаў з Гродзеншчыны на Заходнім Прымор'і» (Б.Франкоўска-Козак, доктар філалагічных навук, Шчэцінскі універсітэт) і інш.

На гістарычна-культурнай секцыі прагучала 19 рэфератаў: «Ігнацый Даніловіч — сын уніяцкага пароха з Грыневіч на Падляшшы, гісторык права і выдавец крыніц Вялікага Княства Літоўскага, у пошуках уласнай нацыянальнай тоеснасці» (Б.Белаказовіч, доктар філалагічных навук, прафесар Вармінска-Мазурскага універсітэта), «Польскія школы на Гродзеншчыне 1944—1948 гг.», (Я.В.Скрабоцкі, галоўны рэдактар часопіса «Магазін Польскі»), «Роля грамадскіх аб'яднанняў у адраджэнні народаў Беларусі» (Т.Ч.Малевіч, намеснік старшыні Союза палякаў на Беларусі), «Дзейнасць беларускіх арганізацый у Польшчы» (Я.Зенюк, грамадскі дзеяч з Беласточчыны) і інш.

У пленарным пасяджэнні і рабоце секцый прынялі ўдзел навукоўцы Беларусі і Польшчы (Беластоцкі, Лодзенскі, Сленскі ў Катовіцах, Ягелонскі, Шчэцінскі, Вармінска-Мазурскі і іншыя універсітэты), прадстаўнікі Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Польшчы і Саюза палякаў на Беларусі (старшыня — Т.Т.Кручкоўскі).

25 лістапада ў Гродзенскім абласным драмтэатры адбыўся VIII Міжнародны фестываль «Артыстычныя сустрэчы «Гродна — Беласток», у якім прынялі ўдзел мастацкія калектывы і выканаўцы БГКТ Польшчы (Беластоцкае ваяводства) і Саюза палякаў Гродзенскай вобласці.

*А.В.Бабіцкі, вядучы спецыяліст аддзела*
*ўстаноў культуры і народнай творчасці*
*Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь*